Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

УДК 002.2+027.08+023.5:[821.161.3+821.161.3.0](043.3)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раманава**
**Жанна Леанідаўна**

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТ

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

па спецыяльнасці 05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства
і кнігазнаўства

Мінск 2015

Навуковая работа выканана на кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Навуковы кіраўнік** – **Лявончыкаў Васіль Емяльянавіч,**
доктар педагагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры тэорыі і гісторыі
інфармацыйна-дакументных камунікацый
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

**Афіцыйныя апаненты** – **Буткевіч Валянціна Уладзіміраўна,**
доктар педагагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры педагогікі
УА «Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны ўніверсітэт»

**Пераверзева Юлія Аляксандраўна,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
загадчык аддзела камплектавання
фонду ДУ «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»

**Апаніруючая арганізацыя** – ДУ «Цэнтральная навуковая бібліятэка
імя Якуба Коласа Нацыянальнай
акадэміі навук Беларусі»

Абарона адбудзецца 17 снежня 2015 года ў 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара 222–83–36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 17 лістапада 2015 года.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый К 09.03.01
кандыдат педагагічных навук, дацэнт Л.І. Казлоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (далей – ІР БМЛЛ) – адзін з кампанентаў метасістэмы інфармацыйных рэсурсаў (далей – ІР), які адыгрывае важную ролю ў выхаванні, адукацыі, інтэлектуалізацыі грамадства, фарміраванні яго культурнага патэнцыялу і сістэмы каштоўнасцей. Будучы носьбітам мастацка-вобразных і навуковых ведаў, інструментам эстэтычнай і навуковай камунікацыі, інфармацыйнага забеспячэння сферы вольнага часу, навуковай, адукацыйнай, прафесійнай сфер, ІР БМЛЛ садзейнічаюць трансляцыі каштоўнасцей нацыянальнай літаратуры і літаратуразнаўства, праяўляючы пры гэтым галіновую спецыфіку, якая вывучана недастаткова. Разам з тым, дзейснае выкарыстанне ІР БМЛЛ непасрэдна звязана з дакладнымі ведамі аб іх сутнасці, спецыфічных уласцівасцях, прынцыпах, функцыях, класіфікацыі, рацыянальнай арганізацыі іх цэласнай сістэмы.

Недастаткова даследаванымі з'яўляюцца таксама пытанні павышэння эфектыўнасці распаўсюджвання ІР БМЛЛ праз сістэму бібліятэк, прыцягнення карыстальнікаў да іх чытання, актуальнасць якіх абумоўлена праблемнай сітуацыяй з выкарыстаннем беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (далей – БМЛЛ), невялікай іх доляй у структуры чытання дзяцей і дарослых. Вырашыць азначаную сітуацыю магчыма пры валоданні бібліятэкарамі-бібліёграфамі тэарэтычнымі асновамі ІР БМЛЛ, уменнямі, навыкамі і вопытам распрацоўкі актуальных праектаў, якія спрыяюць папулярызацыі і павышэнню цікавасці карыстальнікаў да БМЛЛ. Гэта можа быць дасягнута пры мэтанакіраванай і цэласнай падрыхтоўцы спецыялістаў у дадзеным накірунку, якая зараз на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” не прадугледжана. Педагагічныя і бібліятэказнаўчыя даследаванні па дадзеных пытаннях не праводзіліся. Такім чынам, склаўшаяся сітуацыя сведчыць аб супярэчнасцях паміж:

– неабходнасцю назапашвання навуковых ведаў, якія б спрыялі ўдасканаленню сістэмы інфармацыйных рэсурсаў БМЛЛ, працэсаў іх выкарыстання і распаўсюджвання з улікам сучасных патрабаванняў і адсутнасцю абгрунтаваных распрацовак у гэтым накірунку;

– патрэбнасцямі бібліятэчнай практычнай дзейнасці ў спецыялістах, якія могуць на дастаткова высокім узроўні ажыццяўляць папулярызацыю БМЛЛ і адсутнасцю ў ВНУ вучэбнай дысцыпліны, якая б забяспечвала мэтанакіраванае, сістэматычнае авалоданне будучымі бібліятэкарамі-бібліёграфамі неабходнымі для гэтага ведамі, уменнямі і вопытам;

– важнасцю абнаўлення традыцыйных падыходаў навучання пры фарміраванні прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ і недастатковым зместавым і метадычным забеспячэннем гэтай мэты ў адукацыйнай прасторы ВНУ.

Неабходнасць вырашэння дадзеных супярэчнасцей абумовіла актуальнасць дысертацыйнага даследавання.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі***

Дысертацыйнае даследаванне праводзілася ў кантэксце дзяржаўнай стратэгіі развіцця і эфектыўнага выкарыстання культурнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь і накіравана

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

на рэалізацыю мэты і задач Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі на 2011–2015 гады” (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20.12.2010 № 1905). Тэма дысертацыі распрацоўвалася ў межах комплексных кафедральных тэм кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (далей – БДУКМ) “Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы Рэспублікі Беларусь і іх кадравы патэнцыял” (зацв. на пасяджэнні савета ўніверсітэта 20.02.2001, пр. № 6), “Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь у сістэме сацыяльна-культурных камунікацый” (зацв. на пасяджэнні савета ўніверсітэта 21.03.2006, пр. № 7), “Кніжная, бібліятэчная, бібліяграфічная справа ў сістэме бесперапыннай адукацыі Беларусі” (зацв. на пасяджэнні савета ўніверсітэта 21.12.2010, пр. № 4).

***Мэта і задачы даследавання***

*Мэта даследавання* – абгрунтаванне тэарэтыка-метадычных асноў інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

У адпаведнасці з мэтай даследавання пастаўлены наступныя *задачы*:

– удакладніць азначэнне, вызначыць структуру, уласцівасці, прынцыпы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– выявіць функцыі і распрацаваць класіфікацыю інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– вызначыць асаблівасці і ўмовы аптымізацыі сістэмы інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– распрацаваць, абгрунтаваць і апрабаваць методыку і педагагічныя ўмовы фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

***Навуковая навізна***

Упершыню ў беларускім бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве комплексна разгледжаны ІР БМЛЛ; удакладнена іх азначэнне; вызначаны іх двухузроўневая структура, метасістэмныя і спецыфічныя ўласцівасці, агульныя і прыватныя прынцыпы, метасістэмныя і спецыяльныя функцыі; на базе сістэмна-дзейнаснага падыходу распрацавана класіфікацыя на фармальным, функцыянальным, змястоўным узроўнях; абгрунтаваны монакамунікацыйны і полікамунікацыйны кампаненты класіфікацыі; праведзены бібліяметрычны аналіз першаснага і другаснага дакументных патокаў, інтэрнэт-рэсурсаў БМЛЛ, на падставе якога выяўлены тыпа-відавыя асаблівасці і ўмовы ўдасканалення сістэмы ІР БМЛЛ; распрацаваны, абгрунтаваны і апрабаваны методыка і педагагічныя ўмовы фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ, прымяненне якіх садзейнічае мэтанакіраванай і кваліфікаванай дзейнасці бібліятэчных спецыялістаў па распаўсюджванні ў грамадстве ІР БМЛЛ.

***Палажэнні, якія выносяцца на абарону***

1. Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (далей – ІРМЛЛ) – гэта сукупнасць мастацка-вобразных і навуковых ведаў, замацаваных на розных матэрыяльных носьбітах для іх трансляцыі і ажыццяўлення эстэтычнай і навуковай камунікацыі ў грамадстве. Структура ІРМЛЛ абумоўлена структурай дакументных масіваў і прадстаўлена масівамі першасных і другасных дакументаў. Для ІРМЛЛ характэрны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метасістэмныя (атрыбутыўныя і прагматычныя) і спецыфічныя ўласцівасці. Апошнія вызначаюцца асобна для інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры (далей – ІРМЛ) і інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства (далей – ІРЛ), паколькі азначаныя рэсурсы ўтрымліваюць веды рознага характару. Спецыфічнымі ўласцівасцямі ІРМЛ з'яўляюцца: эстэтычны характар ведаў; вобразна-мастацкая форма прадстаўлення матэрыялу; духоўна-асабовасны характар; інтэлектуальны кампанент ведаў; магчымасць варыянтнага ўспрымання і інтэрпрэтацыі тэкстаў; нацыянальная спецыфіка і мова літаратуры і інш. Спецыфічнымі ўласцівасцямі ІРЛ з'яўляюцца: навукова-эстэтычны характар ведаў, мікра- і макразгортванне інфармацыі, адносна павольны перыяд старэння і інш. Уласцівасць выхаваўча-педагагічнага эфекту характэрна для ІРМЛ і ІРЛ. Прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ дыферэнцуюцца на агульныя (мэтазгоднасць, квантуемасць і інш.) і прыватныя (якасная выбіральнасць, комплекснасць мастацка-вобразных ведаў ІРМЛ і інш.).

2. Функцыянальная структура ІРМЛЛ прадстаўлена агульнымі метасістэмнымі (інфармацыйная, кумулятыўная і інш.) і спецыяльнымі функцыямі. Да спецыяльных функцый ІРМЛЛ у адпаведнасці з сістэмна-дзейнасным падыходам належаць: 1) функцыі інфармацыйнага забеспячэння сферы самаадукацыі і вольнага часу, адукацыйнай, прафесійнай, навуковай сфер, праз якія вызначаецца роля ІР як фактара, які забяспечвае ажыццяўленне мастацкай літаратурай і літаратуразнаўствам іх асноўных мэт і задач; 2) функцыі дакументаў мастацкай літаратуры (аксіялагічная, папулярызатарская, бібліятэрапеўтычная) і дакументаў літаратуразнаўства (падагульняючая, мадэлюючая) як матэрыяльных носьбітаў з замацаванымі на іх мастацка-вобразнымі і навуковымі ведамі, праз якія вызначаецца роля названых дакументаў у дачыненні да абслугоўваемых галін мастацтва і навукі; 3) функцыі мастацкай літаратуры як віду мастацтва (эстэтычная, эмацыянальная, этнагенетычная і інш.) і літаратуразнаўства як навуковай дзейнасці (гісторыка-літаратурная, крыніцазнаўчая, тэксталагічная і інш.), характэрныя таксама і для іх ІР, вылучэнне якіх дазваляе вызначыць іх ролю ў развіцці грамадства і асобы.

Класіфікацыя ІРМЛЛ будуецца з улікам спецыфікі мастацкай літаратуры як віду мастацтва і галіны дзейнасці па стварэнні і функцыянаванні эстэтычнай інфармацыі ў грамадстве. Класіфікацыйным крытэрыем на першым узроўні з'яўляецца від ведаў (мастацка-вобразныя і навуковыя), у адпаведнасці з якім выдзяляюцца падсістэмы ІРМЛ і ІРЛ. На другім узроўні ІР гэтых падсістэм па спосабе стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі падзяляюцца на монакамунікацыйны і полікамунікацыйны кампаненты, што дае магчымасць улічыць рэсурсы мастацка-інфармацыйнага, інфармацыйна-рэпрадуктыўнага і інфармацыйна-карыстальніцкага відаў дзейнасці па стварэнні эстэтычнай інфармацыі. Далейшая класіфікацыя ажыццяўляецца па фармальных, фукцыянальных і змястоўных прыметах.

3. Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства – складаная сістэма дакументаў беларускай мастацкай літаратуры, беларускага літаратуразнаўства, бібліяграфічных дакументаў і інтэрнэт-рэсурсаў. Дадзеная сістэма адрозніваецца разгалінаванай тыпа-відавой структурай, для якой характэрна дыспрапарцыянальнасць паміж дакументамі розных тыпаў і відаў; дамінаванне публікацый у перыядычным друку; абмежаванае кола спецыялізаваных перыядычных выданняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

невялікіх тыражоў, у якіх сканцэнтравана асноўная колькасць публікацый; значная зона рассеяння інфармацыі; пераважна тэкставая форма прадстаўлення інфармацыі; дэфіцыт дакументаў на электронных носьбітах, у тым ліку онлайнавага доступу. Аптымізацыя сістэмы ІР БМЛЛ – неабходная ўмова якаснага інфармацыйнага забеспячэння ўсіх сфер БМЛЛ, актыўнага распаўсюджвання мастацка-вобразных і навуковых ведаў у грамадстве, якая прадугледжвае: 1) рацыянальнае ўдасканаленне тыпа-відавой структуры; 2) рэалізацыю ў сістэме ІР БМЛЛ мультымедыйных і інтэрактыўных форм прадстаўлення інфармацыі; 3) развіццё збалансаванай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі, пераважна ў электроннай форме, і даступнай у онлайн-рэжыме; 4) дапаўненне сістэмы ІР БМЛЛ онлайнавымі сінтэтычнымі рэсурсамі, у якіх камбінуецца першасная і другасная інфармацыя навуковага, папулярнага, вучэбнага, даведачнага характару; 5) забеспячэнне аддаленага доступу да кантэнту БМЛЛ праз інтэграваную інфармацыйную платформу і віртуальныя рэгіянальныя літаратурныя карты; 6) дапаўненне сістэмы ІР БМЛЛ функцыянальна неабходным элементам – электроннымі кнігамі; 7) ажыццяўленне комплексу маркетынгавых мерапрыемстваў, у тым ліку інтэрнэт-маркетынгу і маркетынгу ў сацыяльных сетках; 8) рэалізацыя праз сістэму бібліятэк творчых праектаў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці функцыянавання ў грамадстве ІР БМЛЛ.

4. Неабходным фактарам рэалізацыі творчых праектаў, накіраваных на эфектыўнае распаўсюджванне ў грамадстве ІР БМЛЛ праз сістэму бібліятэк, з'яўляецца прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ. Асаблівасцю методыкі яе фарміравання з'яўляецца інтэлектуальна-творчы характар педагагічнага працэсу, які рэалізуецца ў межах вучэбнай дысцыпліны “Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства” і грунтуецца на развіцці асабовасна-афарбаваных каштоўнасных адносін студэнтаў да беларускай мастацкай літаратуры, да праблем яе развіцця і выкарыстання сістэмы ІР БМЛЛ праз актыўную індывідуальную пазнавальную, рэфлексіўную дзейнасць, і ўключэнні студэнтаў у прадукцыйны творчы працэс на падставе сістэмы заняткаў, якія прадугледжваюць іх прафесійную камунікацыю з прадстаўнікамі бібліятэчнай і літаратурнай сфер; аналіз бібліятэчных праектаў; авалоданне метадамі папулярызацыі твораў нацыянальнай літаратуры і праверкі іх эфектыўнасці пры ажыццяўленні распрацаваных творчых праектаў. Прапанаваная методыка ажыццяўляецца на інфармацыйна-аналітычным і праектна-выніковым этапах. Мэта інфармацыйна-аналітычнага этапа – развіццё матывацыі студэнтаў на ажыццяўленне дзейнасці па папулярызацыі БМЛЛ, авалоданне імі комплексам ведаў, неабходных для паляпшэння функцыянавання ІР БМЛЛ у грамадстве. Мэта праектна-выніковага этапа – набыццё студэнтамі ўменняў і навыкаў рэалізацыі праектаў па папулярызацыі БМЛЛ ва ўмовах бібліятэк. Кожны этап мэтава накіраваны на фарміраванне пэўных матывацыйна-каштоўнасных, кагнітыўных і дзейнасна-практычных кампетэнцый.

Крытэрыямі сфарміраванасці кампетэнтнасці студэнтаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ з'яўляюцца каштоўнасныя адносіны да БМЛ як часткі нацыянальнай і сусветнай культуры, усведамленне неабходнасці працы бібліятэкара па яе папулярызацыі; веданне спецыфічных асаблівасцей ІР БМЛЛ, характарыстык іх дакументных патокаў, форм і метадаў работы з нацыянальнай літаратурай; здольнасць прымяняць атрыманыя веды і навыкі пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізацыі праектаў па папулярызацыі БМЛЛ.

Эфектыўнасць методыкі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ залежыць ад педагагічных умоў: 1) стварэння інтэлектуальна-творчага асяроддзя з мэтай фарміравання асабоваснай накіраванасці студэнтаў на вывучэнне і папулярызацыю нацыянальнай літаратуры ў прафесійнай дзейнасці; 2) арыентацыі зместу падрыхтоўкі на авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі па стварэнні збалансаванай сістэмы ІР БМЛЛ ва ўмовах бібліятэкі і арганізацыі свабоднага доступу карыстальнікаў да яе кампанентаў; 3) развіцця навыкаў і вопыту творчай дзейнасці, накіраванай на папулярызацыю БМЛЛ праз установы сістэмы дакументных камунікацый.

***Асабісты ўклад саіскальніка навуковай ступені***

Работа з’яўляецца комплексным самастойным даследаваннем ІР БМЛЛ, у выніку якога ўпершыню: 1) удакладнена азначэнне і вызначана структура ІРМЛЛ; 2) удакладнены агульныя метасістэмныя і выяўлены спецыфічныя ўласцівасці, прыватныя прынцыпы і спецыяльныя функцыі падсістэм ІРМЛ і ІРЛ; 3) вызначаны фармальныя, функцыянальныя і змястоўныя крытэрыі класіфікацыі ІРМЛЛ як прадуктаў інфармацыйна-творчай, інфармацыйна-рэпрадуктыўнай і інфармацыйна-карыстальніцкай дзейнасці па стварэнні і функцыянаванні эстэтычнай інфармацыі. Абгрунтавана дыферэнцыяцыя ІРМЛЛ на монакамунікацыйны і полікамунікацыйны кампаненты ў адпаведнасці са спосабам стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі; 3) на падставе біблiяметрычнага аналізу даследаваны стан сістэмы ІР БМЛЛ, выяўлена яе структура, спецыфіка, праблемы функцыянавання і развіцця і прапанавана сістэма мер па яе аптымізацыі; 4) устаноўлены і сістэматызаваны інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ у адпаведнасці з тыпам кантэнту і спосабам стварэння рэсурса; 5) распрацаваны, абгрунтаваны і апрабаваны методыка і педагагічныя ўмовы фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ, распрацаваны дыягнастычны інструментарый.

***Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў***

Вынікі даследавання апрабаваны на 16 навуковых канферэнцыях, у тым ліку на 8 навуковых, навукова-практычных канферэнцыях міжнароднага ўзроўню: “Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры” (Мінск, 7–8 лют. 2006 г.), “Актуальные вопросы патриотического воспитания молодежи Союзного государства” (Мінск, 8–9 ліст. 2012 г.), “Библиотека как феномен культуры” (Мінск, 23–24 кастр. 2013 г.), “XXI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні” (Мінск, 21–25 мая 2015 г.) і інш.; на 8 канферэнцыях студэнтаў і аспірантаў, прафесарска-выкладчыцкага складу УА “БДУКМ”: “Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай культуры” (Мінск, 23–24 ліст. 2011 г.), “Традыцыйная і сучасная культура Беларусі: гісторыя, актуальны стан, перспектывы” (Мінск, 6 снеж. 2012 г.), “Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва” (Мінск, 28 ліст. 2013 г.) і інш.

Вынікі даследавання знайшлі ўкараненне ў дзейнасці ДУ “Цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага”, бібліятэкі прыходу храма ў гонар іконы Божай Маці “Усіх пакутуючых радасць” пры рэалізацыі праектаў па папулярызацыі БМЛЛ у публічных бібліятэках, што пацвярджаецца 3 актамі аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання (1 акт ад 21.03.2012, 1 акт ад 19.10.2012, 1 акт ад 21.05.2012).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі даследавання прымяняюцца ў адукацыйным працэсе УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, што пацвярджаецца 3 актамі аб практычным выкарыстанні яго вынікаў (1 акт ад 21.09.2012, 1 акт ад 19.09.2012, 1 акт ад 20.09.2012).

***Апублікаванне вынікаў дысертацыі***

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 15 публікацыях агульным аб’ёмам 8,8 аўт. л. Сярод іх 6 артыкулаў у навуковых рэцэнзуемых часопісах, рэкамендаваных ВАК для публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў для педагагічных спецыяльнасцей (2,8 аўт. л.), 2 артыкулы – у навуковых рэцэнзуемых часопісах, рэкамендаваных ВАК для публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў для філалагічных спецыяльнасцей (0,8 аўт. л.), 1 раздзел у калектыўнай манаграфіі (2,3 аўт. л.), 3 артыкулы ў навуковых зборніках (1,6 аўт. л.), 2 матэрыялы навуковых канферэнцый і семінараў, 1 вучэбная праграма (1,3 аўт. л.).

***Структура і аб’ём дысертацыі***

Дысертацыя ўтрымлівае: уводзіны, агульную характарыстыку работы, тры главы, высновы, бібліяграфічны спіс, 7 дадаткаў. Поўны аб’ём дысертацыі складае 518 старонак: 172 – асноўны тэкст (у тым ліку 37 старонак – табліцы і ілюстрацыі); 42 – бібліяграфічны спіс, які складаецца са спісу выкарыстаных крыніц (494 найменні на рускай, беларускай і англійскай мовах) і спісу публікацый аўтара (15 найменняў на беларускай мове); 304 – дадаткі. У дысертацыйнай рабоце прадстаўлены 169 табліц (13 – у асноўным тэксце, 156 – у дадатках), 81 малюнак (6 – у асноўным тэксце, 77 – у дадатках).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**У першай главе “Тэарэтычныя аспекты інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства”** прааналізаваны крыніцы па тэме даследавання, распрацаваны азначэнне, класіфікацыя, выяўлены ўласцівасці, прынцыпы, функцыі ІРМЛЛ.

***У раздзеле 1.1 “Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як аб’ект навуковых даследаванняў: аналітычны агляд літаратуры”*** вызначаны асноўныя падыходы да вывучэння ІР БМЛЛ, абгрунтавана метадалагічная база даследавання. Як кампанент метасістэмы інфармацыйных рэсурсаў ІР БМЛЛ з’яўляюцца крыніцай і сродкам захавання нацыянальнай культуры, эстэтычнага, маральна-этычнага выхавання карыстальнікаў, садзейнічаюць засваенню і развіццю мастацкіх і навуковых ведаў. Сродкам раскрыцця дадзенага патэнцыялу ІР БМЛЛ выступае дзейнасць па іх папулярызацыі праз бібліятэкі. Пры гэтым комплексна ІР БМЛЛ не вывучаліся. Спецыялістамі даследаваліся асобныя тэарэтычныя аспекты ІР як метасістэмы. Пытанні азначэння паняцця ІР, яго сутнасці разглядаліся замежнымі спецыялістамі А.Б. Антапольскім, Н.А. Слядневай, Ю.М. Сталяровым, беларускімі – Н.Ю. Бярозкінай, В.Е. Лявончыкавым і інш. Спробы дэфініцыі ІР сферы эканомікі, палітыкі, права, мастацкай культуры і іншых прадпрымалі Д.Г. Маёраў, І.В. Буркоўскі, А.Л. Салдаткіна, Т.М. Сумінава і інш. Даследаваліся ўласцівасці інфармацыі (М.М. Бонгард, Р.Л. Грышанін і інш.), інфармацыйных і дакументных рэсурсаў, дакументаў (В.Е. Лявончыкаў, Ю.М. Сталяроў, Н.Б. Зіноўева, Н.М. Кушнарэнка і інш.). Асобныя публікацыі прысвечаны прынцыпам бібліяграфічнай дзейнасці, функцыям дакументных рэсурсаў, дакументаў (А.П. Коршунаў, Ю.М. Сталяроў, Н.Б. Зіноўева, Н.М. Кушнарэнка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г.М. Швяцова-Водка і інш.). Рабіліся спробы класіфікацыі ІР і дакументных рэсурсаў (А.Б. Антапольскі, Н.Ю. Бярозкіна, С.Н. Жукаў, Ю.М. Сталяроў), дакументаў (Н.Б. Зіноўева, Н.М. Кушнарэнка), электронных рэсурсаў (В.В. Баркова, Ю.В. Нохрын і інш.). Т.М. Сумінава распрацавала марфалогію тэксту мастацкай культуры як цэласнага спектра ІР. А.Б. Антапольскім вызначаны неабходныя і дапаўняльныя параметры класіфікацыі ІР.

Важнае значэнне для даследавання мелі працы па вывучэнні дакументных патокаў (далей – ДП) на падставе бібліяметрычнага метаду. Тэарэтычныя пытанні бібліяметрыі распрацоўвалі О.І. Ваверэне, А.М. Дзівінскі, Н.А. Сляднева і інш. Агульныя заканамернасці ДП разглядалі Г.Ф. Гардукалава, Т.І. Ключэнка, Э.Я. Ракіцкая і інш. Стан і тэндэнцыі развіцця галіновых ДП вывучалі беларускія спецыялісты І.У. Дрыга, Т.В. Кузьмініч, расійскія – Г.Ф. Гардукалава, А.В. Карыкава, Ю.У. Мяшалкіна і інш. Рэсурсы расійскага літаратурнага Інтэрнэту даследавалі Н.Я. Бяляева, Л.В. Зіміна, А.Ю. Далгаполаў і інш.

Пытанні літаратурнай бібліяграфіі – кампаненту ІРМЛ – разглядалі такія замежныя спецыялісты, як С.П. Бавін, М.І. Давыдава, Н.А. Сляднева, С.А. Трубнікаў, і беларускія – Н.Б. Ватацы, І.У. Дрыга, В.Е. Лявончыкаў, Т.М. Сакалова і інш. Значнымі для даследавання сталі палажэнні аксіялагічнага падыходу да літаратурнай бібліяграфіі, у межах якога яна разглядаецца як сродак духоўнага, эстэтычнага развіцця асобы (С.П. Бавін, М.І. Давыдава, А.С. Трубнікаў і інш.), засваення нацыянальнай культуры, мовы (Л.М. Ісаенка). Пры гэтым у бібліяграфазнаўстве толькі акрэслены некаторыя тэарэтычныя асновы вывучэння ІР, але не разгледжаны спецыфічныя асаблівасці ІРМЛЛ. Не вызначаны тэндэнцыі развіцця ДП БМЛЛ, інтэрнэт-рэсурсаў. У педагогіцы і бібліятэказнаўстве не даследаваны пытанні фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ як неабходнай умовы эфектыўнай працы па прыцягненні карыстальнікаў да іх чытання, распаўсюджвання каштоўнасцей нацыянальнай культуры. Пры гэтым фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці ў розных сферах вывучалася расійскімі (І.С. Буракова, С.А. Езава і інш.) і беларускімі (С.В. Зыгмантовіч, С.А. Паўлава, Ю.А. Пераверзева і інш.) спецыялістамі на падставе дзейнаснага (Ю.К. Бабанскі, Л.С. Выгоцкі, Д.Б. Эльконін і інш), сістэмна-дзейнаснага (А.Г. Асмолаў, П.К. Анохін, М.А. Бернштэйн і інш.), кампетэнтнаснага (В.І. Байдэнка, В.Л. Жук, І.А. Зімняя, А.В. Хутарскі, І.І. Цыркун і інш.) і іншых падыходаў. Склаўшаяся праблемная сітуацыя абумовіла выбар аб'екта і прадмета дысертацыйнага даследавання. Такім чынам, а*б'ектам даследавання* сталі ІР БМЛЛ, *прадметам* – тэарэтычныя пытанні ІР БМЛЛ і метадычныя аспекты фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ.

На падставе аналізу даследаванняў ІР намі вылучаны рэсурсны (А.Б. Антапольскі, В.Е. Лявончыкаў, Ю.В. Нохрын, А.В. Сакалоў, Ю.М. Сталяроў і інш.), сістэмна-дзейнасны (Ю.С. Зубаў, Н.А. Сляднева, Т.М. Сумінава і інш.), аксіялагічны (С.П. Бавін, М.І. Давыдава, А.С. Трубнікаў і інш.) падыходы да іх вывучэння. Паколькі ІР БМЛЛ – гэта сістэма ўзаемазвязаных кампанентаў, якая з'яўляецца вынікам мастацкай і навуковай дзейнасці, патрабуе прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў па папулярызацыі БМЛЛ, фарміруемай у прасторы ВНУ культуры і мастацтваў праз дзейнасць выкладчыка і студэнтаў бібліятэчных факультэтаў, неабходна такая пабудова навуковага даследавання, якая дазволіць выявіць усе характарыстыкі ІР БМЛЛ у азначаных аспектах. Такім чынам, метадалагічную аснову даследавання ІР БМЛЛ складае сістэмна-дзейнасны падыход, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаўняецца рэсурсным падыходам пры даследаванні тэарэтычных асноў ІРМЛЛ і аналізе ДП БМЛЛ, і кампетэнтнасным пры вывучэнні іх педагагічных аспектаў.

Для вырашэння пастаўленых у дысертацыі мэты і задач прымяняліся *тэарэтычныя метады* (аналіз і сінтэз, абагульненне, параўнанне, класіфікацыя), *эмпірычныя* (назіранне, педагагічны эксперымент, анкетаванне, тэставанне); *статыстычныя* (бібліяметрычны, метад статыстычнай апрацоўкі вынікаў эксперыментальнай работы).

***У раздзеле 1.2 "Паняцце, структура, уласцівасці, прынцыпы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства"*** распрацаваны асноўныя тэарэтычныя паняцці. ІРМЛЛ узнікаюць у выніку пазнання рэчаіснасці праз сістэму мастацкіх вобразаў і навуковых катэгорый літаратуразнаўства, што абумоўлівае іх азначэнне як сукупнасці мастацка-вобразных і навуковых ведаў, якія з'яўляюцца неабходнымі элементамі эстэтычнай і навуковай камунікацыі. Фіксацыя мастацка-вобразных і навуковых ведаў на матэрыяльным носьбіце робіць магчымым іх выкарыстанне ў сістэме сацыякультурных камунікацый, дазваляе выконваць пэўныя сацыяльныя функцыі, што з'яўляецца неабходнай умовай існавання гэтых ведаў і дазваляе азначыць іх як "інфармацыйныя рэсурсы". Матэрыяльнай формай прадстаўлення ведаў з'яўляюцца традыцыйныя і электронныя дакументы. Такім чынам, ІРМЛЛ – гэта сукупнасць мастацка-вобразных і навуковых ведаў, замацаваных на розных матэрыяльных носьбітах для іх трансляцыі і ажыццяўлення эстэтычнай і навуковай камунікацыі ў грамадстве.

Пры вызначэнні структуры ІРМЛЛ прынцыповым стала пытанне аб матэрыяльнай адзінцы, якая іх утварае. Паколькі ІРМЛЛ з'яўляюцца элементам шматузроўневай інфармацыйнай сістэмы – "прасторава-часавай сукупнасці" (Т.М. Сумінава) масіваў дакументаў – менавіта дакументныя масівы выступаюць матэрыяльнай адзінкай ІРМЛЛ. Гэтае палажэнне абумоўлівае вызначэнне іх структуры, арыентаванай на структуру дакументных масіваў, якая ў адпаведнасці з бібліяграфічным падыходам складаецца з масіваў першасных і другасных дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (далей – МЛЛ), дынамічнай часткай якіх з'яўляюцца дакументныя патокі.

Ключавыя характарыстыкі ІРМЛЛ – іх уласцівасці, прынцыпы фарміравання, функцыі. Паколькі ІРМЛЛ выступаюць адначасова элементам метасістэмы ІР і сістэмай, якую ўтварае шэраг кампанентаў, то вылучаюцца метасістэмныя і спецыфічныя катэгорыі гэтых паняццяў. Акрамя гэтага, уласцівасці, прынцыпы, функцыі ІРМЛЛ вызначаюцца асобна для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ, што абумоўлена розніцай паміж ведамі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

Уласцівасці ІРМЛЛ падзяляюцца на метасістэмныя (атрыбутыўныя і прагматычныя) і спецыфічныя. Да атрыбутыўных уласцівасцей (аднолькавых для ўсіх галіновых рэсурсаў) належаць: невычарпальнасць, папаўняльнасць, адлюстраванне, безальтэрнатыўнасць, генерацыйны эфект. Прагматычныя ўласцівасці вызначаюцца асобна для ІРМЛ і ІРЛ. *Для падсістэмы ІРЛ* прынцыпова значнымі, як для ІР навуковага характару, з'яўляюцца актуальнасць, навізна, сапраўднасць, карыснасць. *Для падсістэмы ІРМЛ* – актуальнасць, арыгінальнасць, карыснасць. *Спецыфічнымі ўласцівасцямі ІРМЛ* з'яўляюцца: эстэтычны характар ведаў – магчымасць уздзейнічаць не на розум, а на пачуцці чалавека, на эмацыянальную сферу; вобразна-мастацкая форма прадстаўлення матэрыялу – магчымасць праз сістэму мастацкіх вобразаў успрымаць як рэальны тэкст, так і падтэкст твора; дыялагічнасць ІРМЛ – магчымасць для чытача стаць актыўным удзельнікам працэса камунікацыі з аўтарам праз інтэрпрэтацыю твора; інтэлектуальны кампанент ведаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасць варыянтнага ўспрымання і інтэрпрэтацыі тэкстаў мастацкай літаратуры; агульнацікавасць; статычнасць знакавай формы і інш. *Спецыфічнымі ўласцівасцямі ІРЛ* з'яўляюцца: навукова-эстэтычны характар ведаў – адлюстраванне эстэтычных ведаў праз навуковыя; мадэляванне – літаратуразнаўчыя працы з'яўляюцца свайго роду мадэлямі свету мастацкай літаратуры, у якіх прадстаўлена яго разнастайнасць і супярэчлівасць з пазіцый сучаснай навукі і грамадскага жыцця; залежнасць зместу літаратуразнаўчых прац і вызначэння якасных характарыстык літаратурных твораў ад творчых і інтэлектуальных здольнасцей аўтара і культурнага кантэксту пэўнай эпохі і інш. Уласцівасць выхаваўча-педагагічнага эфекту з'яўляецца агульнай для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ, вызначэнне якой дэтэрмінуецца моцным уздзеяннем МЛЛ на разнавектарнае развіццё і выхаванне асобы і грамадства, магчымасцю выкарыстання гэтых рэсурсаў у педагагічнай дзейнасці.

У складзе прынцыпаў фарміравання ІРМЛЛ вылучаюцца агульныя (квантуемасці, аптымальнасці і інш.) і прыватныя (дакладнасці, якаснай выбіральнасці, аб'ектыўнасці і інш.). Прыватныя прынцыпы абумоўлены такімі спецыфічнымі для МЛЛ рысамі, як іх аксіялагічная накіраванасць – магчымасць уздзеяння на фарміраванне духоўнай культуры грамадства, яго каштоўнасных арыенціраў, а таксама іх эстэтычны характар – здольнасць абуджаць эмоцыі, фарміраваць эстэтычны густ. Асаблівае месца займае прынцып комплекснасці мастацка-вобразных ведаў ІРМЛ, згодна з якім ІРМЛ павінны садзейнічаць фарміраванню асобы, развіццю яе інтэлекту, маральных якасцей і светапогляду.

***У раздзеле 1.3 "Функцыянальная структура і класіфікацыя інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства"*** абгрунтавана функцыянальная структура ІРМЛЛ, прадстаўленая двума падсістэмамі: агульнымі метасістэмнымі функцыямі (інфармацыйная, ідэнтыфікацыйная і інш.) і спецыяльнымі. Спецыяльныя функцыі ІРМЛЛ вызначаны на падставе сістэмна-дзейнаснага падыходу, згодна з якім ІРМЛЛ з'яўляюцца сістэмай і ўзнікаюць у працэсе дзейнасці чалавека. У адпаведнасці з гэтым выдзяляюцца тры групы функцый. Першая група – функцыі інфармацыйнага забеспячэння сфер дзейнасці ў галіне МЛЛ: сферы вольнага часу і самаадукацыі, адукацыйнай, прафесійнай, навуковай. Другая група – функцыі дакументаў МЛЛ як матэрыяльных носьбітаў і транслятараў зафіксаваных на іх ведаў: аксіялагічная, папулярызатарская, бібліятэрапеўтычная (функцыі дакументаў мастацкай літаратуры); падагульняючая, мадэлюючая (функцыі дакументаў літаратуразнаўства). Трэцяя група – функцыі, якія ўласцівы мастацкай літаратуры як пэўнаму віду мастацтва (эстэтычная, эмацыянальная, этнагенетычная, рэкрэацыйная, адукацыйная, развіццёвая і інш.) і літаратуразнаўству як навуцы (крыніцазнаўчая, літаратурна-крытычная, тэксталагічная, эстэтычная і інш.), і адлюстроўваюць іх сутнасць і ўздзеянне на чалавека.

У адпаведнасці з сістэмна-дзейнасным падыходам ажыццяўлялася і класіфікацыя ІРМЛЛ. Неабходнымі класіфікацыйнымі прыметамі вызначаны фармальныя (від носьбіта ІР; форма прадстаўлення інфармацыі; для ІРМЛ – краіна, мова, храналагічны перыяд); функцыянальныя (грамадскае прызначэнне ІР), змястоўныя (змест ІР). Згодна з сістэмна-дзейнасным падыходам мастацкая літаратура з'яўляецца відам мастацтва і адначасова – вынікам дзейнасці, звязанай са стварэннем і функцыянаваннем у грамадстве эстэтычнай інфармацыі, а таму ўключае два кампаненты – мастацкі і інфармацыйна-дзейнасны. Мастацкі кампанент прадстаўлены сістэмай асноўных прадуктаў пэўнага віду мастацтва – творамі мастацкай літаратуры, якія класіфікуюцца ў дадзеным аспекце ў адпаведнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з марфалогіяй мастацтва па класах, сямействах, родах і жанрах.

Класіфікацыя ІРМЛЛ як выніку дзейнасці па стварэнні і функцыянаванні ў грамадстве эстэтычнай інфармацыі ажыццяўляецца на падставе агульнай відавой структуры інфармацыйнай дзейнасці. Пры гэтым улічваюцца ўсе віды ІР, якія ўзнікаюць у інфармацыйна-творчай, інфармацыйна-рэпрадуктыўнай, інфармацыйна-карыстальніцкай дзейнасці і размяжоўваюцца ІР, якія ўтрымліваюць веды рознага характару – мастацка-вобразныя і навуковыя. У адпаведнасці з гэтым выдзяляюць дзве падсісэмы ІРМЛЛ: ІРМЛ і ІРЛ. Рэсурсы гэтых падсістэм па спосабе стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі падзяляюцца на монакамунікацыйныя і полікамунікацыйныя. Монакамунікацыйныя рэсурсы (першасныя і другасныя) ствараюцца пэўнымі нешматлікімі суб’ектамі – аўтарамі і пасіўна спажываюцца шырокай чытацкай аўдыторыяй. Пры гэтым узаемадзеянне аўтара і чытачоў з’яўляецца адцягнутым у прасторы і часе і дастаткова пасіўным. Полікамунікацыйныя рэсурсы ствараюцца непасрэдна многімі карыстальнікамі падчас камунікацыі ў вэб-асяроддзі. Пры гэтым узаемадзеянне паміж аўтарамі і чытачамі, а таксама чытачоў паміж сабой з’яўляецца аператыўным, неадкладным і ажыццяўляецца з дапамогай сацыяльных медыя, рэкамендацыйных сэрвісаў, вэбінараў. Далейшая класіфікацыя ІРМЛЛ ажыццяўляецца на падставе фармальных, функцыянальных і змястоўных крытэрыяў з улікам спецыфікі галіновых рэсурсаў.

**Другая глава “Сучасны стан і накірункі развіцця інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства”** утрымлівае аналіз асаблівасцей сістэмы інфармацыйных рэсурсаў БМЛЛ і абгрунтаванне ўмоў яе аптымізацыі.

***У раздзеле 2.1 “Сучасны стан і накірункі развіцця дакументных патокаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства”*** на падставе шматаспектнага бібліяметрычнага аналізу актыўных кампанентаў ІР БМЛЛ – іх дакументных патокаў, вызначаны асноўныя характарыстыкі (тыпа-відавыя, выдавецкія, моўныя, тэматычныя, аўтарскія) і праблемы функцыянавання сістэмы ІР БМЛЛ на сучасным этапе на фармальным, функцыянальным і змястоўным узроўнях класіфікацыі. Усяго за шасцігадовы перыяд было выяўлена і прааналізавана 24847 выданняў і публікацый у патоку беларускай мастацкай літаратуры і 7190 – у патоку беларускага літаратуразнаўства.

На **фармальным узроўні** сістэма ІР БМЛЛ характарызуецца дамінаваннем друкаваных тэкставых дакументаў. Электронныя першасныя дакументы прадстаўлены тэкставымі дакументамі ў Інтэрнэце, лакальных бібліятэчных паўнатэкставых базах даных, у складзе электронных тэматычных калекцый і віртуальных праектаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (далей – НББ), на CD-ROMах. Дакументы на беларускай мове складаюць 80% патоку літаратуразнаўства і 46% патоку мастацкай літаратуры. Для патоку мастацкай літаратуры характэрна шырокая аўтарская структура (866 аўтараў), якая мае тэндэнцыю да павелічэння. Асноўную колькасць складаюць аўтары, творы якіх публікаваліся аднойчы на працягу трох гадоў – 83%. Пераважаюць публікацыі сучасных беларускіх паэтаў, якія пішуць на рускай мове. Аб’ёмы і тыражы такіх выданняў невялікія.

На **функцыянальным узроўні** ІР БЛ прадстаўлены мікрапатокамі навуковых дакументаў (47%), вучэбных (46%), навукова-папулярных (6%), даведачных (1%), кожны з якіх адрознівае шэраг асаблівасцей. Для *мікрапатоку навуковых дакументаў* характэрна невялікая колькасць асобных выданняў (4%), адсутнасць некаторых відаў дакументаў (крыніцазнаўчых, збораў твораў і выбраных твораў літаратуразнаўцаў), дамінаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікацый у перыядычным друку (96%) пры іх сканцэнтраванасці ў некалькіх профільных часопісах, якія не маюць вялікіх тыражоў (“Роднае слова”, “Полымя”, “Маладосць”), значная зона рассеяння інфармацыі (64%), адносная політэматычнасць (128 тэм). *Мікрапаток даведачных дакументаў* развіваецца слаба, адсутнічае большасць іх відаў, у тым ліку і сучасная агульналітаратурная навуковая энцыклапедыя. За даследуемы перыяд выйшла пяць даведачных выданняў (1 тэрміналагічны слоўнік і 4 даведнікі). *Мікрапаток вучэбных дакументаў* адрозніваецца разгалінаванай тыпа-відавой сістэмай выданняў, якія дыферынцуюцца па чытацкім прызначэнні, па месцы ў сістэме адукацыі, па ролі ў вучэбным працэсе. Асобныя выданні складаюць 27%, публікацыі ў перыядычным друку – 73% (сярод іх 76% – публікацыі ў часопісах “Беларуская мова і літаратура”, “Роднае слова”). Больш за ўсё ў патоку выданняў для агульнаадукацыйных школ (76%). Дамінуюць дапаможнікі для навучэнцаў, сярод якіх прысутнічаюць спецыфічныя для галіны іх віды – хрэстаматыі, кнігі для чытання, сачыненні, але колькасць іх зніжаецца (з 32% да 10%). Доля падручнікаў нязначная і мае тэндэнцыю да скарачэння (з 22% да 3%).

Інфармацыйныя рэсурсы БМЛ прадстаўлены пераважна масавымі выданнямі (98%). Навуковыя выданні нешматлікія (0,5%), іх электронныя аналагі адсутнічаюць, колькасць навукова-масавых выданняў невялікая (1,5%), што дрэнна адбіваецца на інфармацыйным забеспячэнні навуковай і адукацыйнай сфер. Увогуле доля асобных выданняў у патоку складае 11%. Асноўнае месца сярод іх займаюць масавыя выданні зборнікаў (66%) пераважна сучасных рускамоўных паэтаў. Публікацыі ў перыёдыцы складаюць 89%. Палова з іх – публікацыі ў часопісах “Маладосць”, “Полымя”, “Нёман”.

На **змястоўным узроўні** ў ДП БЛ пераважаюць галіновыя і персанальныя ІР, у ДП БМЛ – персанальныя. Тэматычныя, жанравыя, краязнаўчыя ІР нешматлікія.

Такім чынам, аналіз стану ДП БМЛЛ сведчыць аб няпоўнай адпаведнасці сістэмы ІР БМЛЛ патрабаванням навукі, адукацыі і сферы вольнага часу. Аптымізацыі сістэмы ІР БМЛЛ, эфектыўнаму яе выкарыстанню і папулярызацыі будзе спрыяць пашырэнне відавога складу дакументаў; павелічэнне колькасці электронных дакументаў офлайн- і онлайн-доступу, у тым ліку мультымедыйных; стварэнне прафесійнай электроннай бібліятэкі БМЛ; змяненне падыходаў да арганізацыі літаратурных мерапрыемстваў у бібліятэках, навучальных установах, распрацоўка рэкламных і PR-кампаній.

***У раздзеле 2.2 “Сучасны стан і накірункі развіцця патоку бібліяграфічных рэсурсаў і інтэрнэт-рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства”*** пры дапамозе бібліяметрычнага метаду даследаваны паток бібліяграфічных дакументаў БМЛЛ (выяўлена 966 крыніц), вызначаны яго асноўныя тыпа-відавыя характарыстыкі, праблемы і перспектывы функцыянавання, прааналізаваны інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ.

На **фармальным узроўні** паток бібліяграфічных рэсурсаў БМЛЛ прадстаўлены тэкставымі друкаванымі дакументамі і электроннымі (каталогамі: лакальнымі і аддаленага доступу; універсальнымі, шматгаліновымі, персанальнымі, тэматычнымі, краязнаўчымі, камбінаванымі базамі даных; бібліяграфіяй у Інтэрнэце; электроннымі выданнямі). На **функцыянальным узроўні** ДП бібліяграфічных рэсурсаў БМЛЛ не атрымаў дастатковага развіцця. Крыніц спецыяльнай бягучай бібліяграфічнай інфармацыі не існуе. Не развіваецца сістэма рэтраспектыўнай бібліяграфіі. Вучэбна-дапаможная бібліяграфічная інфармацыя прадстаўлена прыкніжнымі і прыартыкульнымі спісамі. Адсутнасць асобнікаў, у першую чаргу электронных, з магчымасцю інтэрактыўнай падачы інфармацыі, пазбаўляе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальнікаў патрэбнай інфармацыі. На **змястоўным узроўні** сістэма бібліяграфічных рэсурсаў БМЛЛ прадстаўлена ў асноўным персанальнымі бібліяграфічнымі крыніцамі. Жанравыя, тэматычныя, краязнаўчыя картатэкі і базы даных пераважна лакальныя.

Аптымізацыі сістэмы бібліяграфічных рэсурсаў БМЛЛ паспрыяе павелічэнне колькасці друкаваных і электронных бібліяграфічных рэсурсаў розных тыпаў, відаў і жанраў, у тым ліку ў мультымедыйнай інтэрактыўнай форме; дапаўненне сістэмы онлайнавымі сінтэтычнымі рэсурсамі, у якіх камбінуецца першасная і другасная інфармацыя навуковага, папулярнага, вучэбнага, даведачнага характару.

Інтэрнэт-доступ да рэсурсаў БМЛЛ забяспечвае знаёмства з нацыянальнай культурай і яе папулярызацыю. Асноўным крытэрыем класіфікацыі інтэрнэт-рэсурсаў БМЛЛ з'яўляецца тып кантэнту, згодна з якім выдзяляюцца інтэрнэт-рэсурсы ўласна літаратурныя і змешанага кантэнту. Такім чынам размяжоўваюцца сайты, якія адлюстроўваюць толькі рэсурсы БМЛЛ, і сайты, змест якіх тычыцца ІР БМЛЛ часткова. Па спосабе стварэння інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ падзяляюцца на алічбаваныя і першапачаткова створаныя ў лічбавым фармаце. Многія рэсурсы ўтрымліваюць і бібліяграфічную інфармацыю, але з найбольшай паўнатой яна адлюстравана на сайтах бібліятэк. Электронных бібліятэк БМЛ, якія прадстаўляюць толькі тэксты твораў, няма.

Забеспячэнне доступу да якаснага кантэнту БМЛЛ у лічбавым фармаце можа быць рэалізавана праз стварэнне рэгіянальных віртуальных літаратурных карт і інтэграванай інфармацыйнай платформы БМЛ, пабудаванай на карпаратыўнай аснове пры ўдзеле зацікаўленых арганізацый, якія маюць профільныя рэсурсы. У межах платформы ўся інфармацыя структуруецца на адзіных прынцыпах і звязваецца сістэмай гіперспасылак. Структура дадзенага рэсурсу павінна ўключаць наступныя раздзелы: 1) БМЛ; 2) БЛ; 3) літаратурная адукацыя; 4) каталог інтэрнэт-рэсурсаў БМЛЛ з гіперспасылкамі на іх; 5) форум для абмеркавання літаратурных твораў і падзей. Ядро платформы – якасная электронная бібліятэка БМЛ, у якой поўныя тэксты твораў дапоўнены гіперспасылкамі на іх інтэрпрэтацыю ў іншых жанрах мастацтва; віртуальныя падарожжы па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменнікаў, з падзеямі, апісанымі ў творах.

**У трэцяй главе "Методыка фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства"** адлюстраваны змест і рэалізацыя эксперыментальнай работы.

***У раздзеле 3.1 "Арганізацыя працэсу фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства"*** прадстаўлены змест праграмы і методыкі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ, распрацаваны дыягнастычны інструментарый. Адным з фактараў, які спрые эфектыўнаму распаўсюджванню і выкарыстанню ў грамадстве ІР БМЛЛ, з'яўляецца прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ – інтэгратыўная якасць асобы, якая базуецца на ведах, уменнях і вопыце арганізацыі доступу карыстальнікаў да збалансаванай сістэмы ІР БМЛЛ, распрацоўкі і рэалізацыі праектаў, накіраваных на папулярызацыю БМЛЛ ў працэсе інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў, і праяўляецца ў здольнасці прымяняць іх у практычнай дзейнасці з улікам сацыякультурнай сітуацыі, патрэб грамадства, развіцця літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў адзінстве з каштоўнаснымі арыентацыямі спецыяліста, матываванасцю яго на неабходнасць ажыццяўлення дадзенага аспекту прафесійнай дзейнасці.

Фарміраванне азначанай кампетэнтнасці ажыццяўляецца як цэласны педагагічны працэс у межах дысцыпліны "Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства" і накіравана на комплекснае развіццё наступных кампанентаў. Матывацыйна-каштоўнаснага, які забяспечвае матывацыю на неабходнасць працы бібліятэкара па папулярызацыі БМЛЛ, каштоўнасныя адносіны да яе чытання. Кагнітыўнага, які дазваляе авалодаць тэарэтычнымі пытаннямі ІРМЛЛ і выкарыстоўваць дадзеныя веды для паляпшэння практычнай дзейнасці па фарміраванні ІР БМЛЛ. Дзейнасна-практычнага, які забяспечвае здольнасць да арганізацыі праектаў па папулярызацыі БМЛЛ ва ўмовах бібліятэк.

Вопытна-эксперыментальная работа па фарміраванні прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ праходзіла на базе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый УА "БДУКМ" у 2006–2012 гг. і ўключала тры этапы: падрыхтоўча-канстатуючы, эксперыментальна-фарміруючы, вынікова-абагульняючы. У эксперыменце прынялі ўдзел 57 студэнтаў 3 курса (28 – у эксперыментальнай групе, 29 – у кантрольнай), што дастаткова для забеспячэння рэпрэзентатыўнасці яго вынікаў.

Змест распрацаванай методыкі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ адлюстраваны ў вучэбнай праграме дысцыпліны "Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства", якая складаецца з трох раздзелаў: "Тэарэтычныя пытанні ІР БМЛ", "Дакументныя рэсурсы БМЛЛ", "Папулярызацыя БМЛЛ у практыцы работы бібліятэкі". Методыка прадугледжвае фарміраванне кампетэнцый, якія дазваляюць бібліятэкару-бібліёграфу ведаць спецыфіку БМЛЛ і мець матывацыю і каштоўнасныя ўстаноўкі на іх самастойнае вывучэнне; мець здольнасць да папулярызацыі БМЛЛ у прафесійнай дзейнасці; валодаць паняццямі тэорыі ІР; умець выкарыстоўваць ІР БМЛЛ у бібліятэчна-бібліяграфічным абслугоўванні; валодаць методыкай бібліяметрычнага аналізу рэсурсаў, выкарыстоўваць гэтыя ўменні пры стварэнні сістэмы ІР БМЛЛ і арганізацыі доступу карыстальнікаў да яе кампанентаў; ведаць тыпы карыстальнікаў БМЛ і валодаць спосабамі камунікацыі з імі; валодаць формамі і метадамі папулярызацыі БМЛЛ у бібліятэках і інш.

Для ацэнкі сфарміраванасці кампетэнтнасці студэнтаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ былі вызначаны крытэрыі: 1) асабовасна-аксіялагічны – развіццё каштоўнасных адносін да БМЛ і перакананасць у неабходнасці прафесійнай працы бібліятэкара па яе папулярызацыі; 2) гнасеалагічны – набыццё ведаў аб тэарэтычных аспектах ІР БМЛЛ, спецыфіцы іх дакументных патокаў, асаблівасцях розных груп карыстальнікаў, аб формах і метадах работы з нацыянальнай літаратурай; 3) творча-тэхналагічны – здольнасць распрацоўваць сацыяльныя праекты па папулярызацыі БМЛЛ, ажыццяўляць прафесійную камунікацыю, творча прымяняць на практыцы атрыманыя веды і навыкі. Для кожнага крытэрыю былі распрацаваны паказчыкі, якія дазваляюць ажыццявіць дыягностыку даследуемай прафесійнай кампетэнтнасці. Метадамі вызначэння паказчыкаў стала анкетаванне, тэставанне, назіранне ў ходзе заняткаў, падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў ва ўмовах бібліятэкі, аналіз і ацэнка выкананых практычных і творчых работ. У адпаведнасці з крытэрыямі і паказчыкамі былі вызначаны нізкі, сярэдні і высокі ўзроўні сфарміраванасці прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***У раздзеле 3.2 “Рэалізацыя методыкі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства і дыягностыка яе эфектыўнасці”*** прадстаўлены працэс і вынікі эксперыментальнага даследавання. Фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ ажыццяўлялася паслядоўна на двух этапах – інфармацыйна-аналітычным і праектна-выніковым. На інфармацыйна-аналітычным этапе ў межах вывучэння раздзелу “Тэарэтычныя пытанні ІР БМЛЛ” праграмы дысцыпліны “Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства” фарміравалася матывацыя студэнтаў на ажыццяўленне праектаў па папулярызацыі БМЛЛ, набываліся веды аб адметнасці БМЛЛ, аб спецыфічных тэарэтычных аспектах ІРМЛЛ. У межах раздзелу “Дакументныя рэсурсы БМЛЛ” фарміраваліся навыкі аналізу ДП БМЛЛ. Асноўнымі відамі вучэбных заняткаў з’явіліся праблемныя лекцыі (“Мастацкая літаратура як від мастацтва і частка нацыянальнай культуры. Літаратуразнаўства як навука: азначэнне, структура, месца ў культуры”, “Класіфікацыя ІРМЛ і ІРЛ” і інш.); семінары метадам актыўнага дыялогу (“Адметныя асаблівасці беларускай нацыянальнай літаратуры і літаратуразнаўства. Іх значэнне для фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці і захавання нацыянальнай культуры”), метадам “круглага стала” (“Тэарэтычныя пытанні ІРМЛЛ”); практычныя работы з групавым абмеркаваннем іх вынікаў (“Аналіз ДП БМЛ”, “Аналіз літаратурна-мастацкіх і літаратуразнаўчых перыядычных выданняў Рэспублікі Беларусь” і інш.), “Прэс-канферэнцыя з супрацоўнікамі літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў”, накіраваная на стварэнне інтэлектуальна-творчага асяроддзя, набыццё вопыту арганізацыі камунікацыі з прадстаўнікамі літаратурных колаў.

Асобае значэнне для фарміравання станоўчай матывацыі на авалоданне прафесійнай кампетэнтнасцю ў сферы папулярызацыі БМЛЛ меў прапанаваны намі метад творчай правакацыі, які ажыццяўляўся па наступным алгарытме: 1) праблемная лекцыя па тэме “Мастацкая літаратура як від мастацтва і частка нацыянальнай культуры. Літаратуразнаўства як навука: азначэнне, структура, месца ў культуры”; 2) самастойнае пісьмовае творчае заданне па выніках абмеркавання акрэсленых праблем – эсэ “Тры з’явы нацыянальнай культуры і тры творы нацыянальнай літаратуры, якімі я ганаруся”; 3) рэфлексія – калектыўнае абмеркаванне выкананых творчых заданняў, падчас якога выкладчыкам правакуюцца крытычныя аб’ектыўныя адносіны студэнтаў да сваіх работ; 4) паўторнае асэнсаванае выкананне задання ў выглядзе электроннай прэзентацыі твораў беларускай літаратуры, якія зацікавілі студэнтаў.

На праектна-выніковым этапе адбывалася навучанне эфектыўным метадам папулярызацыі БМЛЛ ва ўмовах бібліятэк, набыццё ўласнага вопыту рэалізацыі праектаў па гэтым накірунку, што ажыццяўлялася ў межах трэцяга раздзелу вучэбнай праграмы “Папулярызацыя БМЛЛ як адзін з асноўных кірункаў дзейнасці публічных бібліятэк”. Асноўныя віды вучэбных заняткаў – лекцыі (“Прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкара ў сферы папулярызацыі БМЛЛ”, “Чытачы БМЛ. Формы і метады работы з карыстальнікамі бібліятэк па папулярызацыі БМЛЛ”), майстар-класы супрацоўнікаў Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага па тэмах “Самыя чытаемыя і папулярныя творы БМЛ”, “Асаблівасці папулярызацыі твораў беларускай літаратуры сярод розных катэгорый карыстальнікаў”, практычныя работы (наведванне бібліятэчных мерапрыемстваў, прысвечаных беларускім аўтарам); самастойная распрацоўка і рэалізацыя студэнтамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праектаў непасрэдна ў бібліятэках.

Па завяршэнні эксперыментальна-фарміруючага этапу даследавання была праведзена заключная дыягностыка сфарміраванасці ў студэнтаў кантрольнай і эксперыментальнай груп прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ. Комплексная ацэнка ўзроўню сфарміраванасці ўсіх кампанентаў прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў паказвае, што лепшыя вынікі назіраюцца ў студэнтаў эксперыментальнай групы пасля заканчэння фарміруючага эксперыменту. Колькасць студэнтаў, якія павысілі свой узровень да высокага, у эксперыментальнай групе ўзрасла на 7%, колькасць студэнтаў з сярэдім узроўнем – на 25%. Колькасць студэнтаў з нізкім узроўнем скарацілася на 32%. У кантрольнай групе размеркаванне па ўзроўнях змянілася нязначна (табліца 1).

**Табліца 1** – Сфарміраванасць комплексу кампанентаў прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ на стадыі канстатуючага і фарміруючага эксперыментаў

| Група | Этап эксперыменту | Узровень сфарміраванасці прафесійнай кампетэнтнасці | | | | | | Ср | Кэф | $\chi^2$ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | нізкі | | сярэдні | | высокі | | | | |
| | | Коль-касць | % | Коль-касць | % | Коль-касць | % | | | |
| **ЭГ** | Канстатуючы эксперымент | 14 | 50 | 9 | 32 | 5 | 18 | 1,679 | 1,107 | 1,883 |
| | Фарміруючы эксперымент | 5 | 18 | 16 | 57 | 7 | 25 | 2,071 | 1,251 | 9,346 |
| **КГ** | Канстатуючы эксперымент | 19 | 66 | 5 | 17 | 5 | 17 | 1,517 | — | — |
| | Фарміруючы эксперымент | 16 | 55 | 7 | 24 | 6 | 21 | 1,655 | — | — |

Для вызначэння эфектыўнасці прапанаванай методыкі быў выкарыстаны метад статыстычнай праверкі гіпотэз на падставе крытэрыю хі-квадрат, які паказаў, што пасля заканчэння фарміруючага эксперыменту значэнне $\chi^2_{эмп}$ з'яўляецца значна большым за $\chi^2_{крыт}$ ($\chi^2_{эмп}$ = 9,346 > 5,99 = $\chi^2_{крыт}$) пры верагоднасці адрозненняў характарыстык эксперыментальнай і кантрольнай груп 95%. Гэта дазваляе сцвярджаць, што павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў эксперыментальнай групы з'яўляецца статыстычна значным, выклікана ўздзеяннем эксперыментальнага фактару і пацвярджае эфектыўнасць абгрунтаванай методыкі і наступных педагагічных умоў: стварэння інтэлектуальна-творчага асяроддзя з мэтай фарміравання асабоваснай накіраванасці студэнтаў на вывучэнне і папулярызацыю нацыянальнай літаратуры ў прафесійнай дзейнасці; арыентацыі зместу падрыхтоўкі на авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі па стварэнні збалансаванай сістэмы ІР БМЛЛ ва ўмовах бібліятэкі і арганізацыі свабоднага доступу карыстальнікаў да яе кампанентаў; развіцця навыкаў і вопыту творчай дзейнасці па папулярызацыі БМЛЛ праз установы сістэмы дакументных камунікацый.

## ВЫСНОВЫ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства – гэта сукупнасць мастацка-вобразных і навуковых ведаў, замацаваных на розных матэрыяльных носьбітах для іх трансляцыі і ажыццяўлення эстэтычнай і навуковай камунікацыі ў грамадстве. Структура ІРМЛЛ вызначаецца намі зыходзячы са структуры дакументных масіваў і складаецца з двух узроўняў, вылучаных у адпаведнасці са спосабам адлюстравання інфармацыі: масіў першасных дакументаў, масіў другасных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйныя рэсурсы МЛЛ – элемент метасістэмы ІР і адначасова сістэма, якую ўтвараюць падсістэмы ІРМЛ і ІРЛ. Для гэтых падсістэм характэрны метасістэмныя і спецыфічныя ўласцівасці, прынцыпы і функцыі. Выяўлены метасістэмныя ўласцівасці ІРМЛЛ (атрыбутыўныя і прагматычныя) і спецыфічныя. Да атрыбутыўных аднесены невычарпальнасць, папаўняльнасць, адлюстраванне, безальтэрнатыўнасць, генерацыйны эфект. У якасці прагматычных для падсістэмы ІРЛ вызначаны актуальнасць, навізна, сапраўднасць, карыснасць; для падсістэмы ІРМЛ – актуальнасць, арыгінальнасць, карыснасць. Да спецыфічных уласцівасцей ІРМЛ адносяцца: эстэтычны характар ведаў; вобразна-мастацкая форма прадстаўлення матэрыялу; духоўна-асабовасны характар; інтэлектуальны кампанент ведаў; унікальнасць і інварыянтнасць мастацкага тэксту; магчымасць варыянтнага ўспрымання і інтэрпрэтацыі тэкстаў мастацкай літаратуры; дыялагічнасць ІРМЛ; уласцівасць агульнацікавасці; статычнасць знакавай формы; макразгортванне інфармацыі; адсутнасць старэння тэкстаў мастацкай літаратуры нароўні з адносна павольным старэннем ІРМЛ; нацыянальная спецыфіка літаратуры і яе мова. Спецыфічнымі ўласцівасцямі ІРЛ з'яўляюцца: навукова-эстэтычны характар ведаў, мікра- і макразгортванне інфармацыі, адносна павольны перыяд старэння літаратуразнаўчых прац, мадэляванне, залежнасць зместу літаратуразнаўчых прац і вызначэння якасных характарыстык літаратурных твораў ад творчых і інтэлектуальных здольнасцей аўтара і культурнага кантэксту эпохі. Агульнай для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ з'яўляецца ўласцівасць выхаваўча-педагагічнага эфекту, вызначэнне якой абумоўлена ўздзеяннем МЛЛ на выхаванне асобы, магчымасцю выкарыстання рэсурсаў у педагагічнай дзейнасці.

Вызначаны агульныя прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ (мэтазгоднасць, квантуемасць, аптымальнасць, размежаванне доступу) і прыватныя (паўната, дакладнасць, якасная выбіральнасць, аб'ектыўнасць, цэласнасць, комплекснасць мастацка-вобразных ведаў ІРМЛ). Прыватныя прынцыпы дэтэрмінуюцца такімі спецыфічнымі для МЛЛ рысамі, як аксіялагічны характар і здольнасць абуджаць эмоцыі, фарміраваць эстэтычны густ [1; 3; 9].

2. Функцыянальная структура ІРМЛЛ прадстаўлена двума кампанентамі: агульнымі метасістэмнымі функцыямі (інфармацыйная, кумулятыўная, пошукавая, ідэнтыфікацыйная) і спецыяльнымі. Спецыяльныя функцыі падзяляюцца на тры групы: 1) функцыі інфармацыйнага забеспячэння сферы вольнага часу і самаадукацыі, адукацыйнай, прафесійнай, навуковай сфер; 2) функцыі дакументаў мастацкай літаратуры (аксіялагічная, папулярызатарская, бібліятэрапеўтычная) і дакументаў літаратуразнаўства (падагульняючая, мадэлюючая) як матэрыяльных носьбітаў з замацаванымі на іх навуковымі і мастацка-вобразнымі ведамі; 3) функцыі мастацкай літаратуры як віду мастацтва (эстэтычная, эмацыянальная, этнагенетычная, рэкрэацыйная, пазнавальная, духоўна-камунікатыўная, адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая) і літаратуразнаўства як навуковай дзейнасці (гісторыка-літаратурная, крыніцазнаўчая, тэксталагічная, літаратурна-крытычная, эстэтычная, адукацыйная, выхаваўчая), характэрныя таксама і для іх ІР. Падобнае вызначэнне функцый галіновых рэсурсаў пазбаўляе ад прамога пераносу функцый абслугоўваемай галіны на яе ІР і дазваляе размежаваць ролю, якую выконваюць мастацкая літаратура і літаратуразнаўства, і ролю, якую выконваюць іх ІР [2; 8; 9].

Пры класіфікацыі ІРМЛЛ прынцыповымі з'яўляюцца палажэнні сістэмна-дзейнаснага падыходу, згодна з якім мастацкая літаратура разглядаецца адначасова як від мастацтва і як

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

дзейнасць па стварэнні і функцыянаванні эстэтычнай інфармацыі ў грамадстве, а таму ўключае два кампаненты. Першы – мастацкі, прадстаўлены творамі мастацкай літаратуры, якія класіфікуюцца ў адпаведнасці з марфалогіяй мастацтва па класах, сямействах, родах і жанрах. Другі – інфармацыйна-дзейнасны, прадстаўлены масівамі і патокамі дакументаў МЛЛ (прадукты інфармацыйна-творчай дзейнасці); масівамі і патокамі даведачных, вучэбных дакументаў, бібліяграфічнай і агляднай інфармацыі (прадукты інфармацыйна-рэпрадуктыўнай дзейнасці); водгукамі, каментарыямі, фанрайтэрствам і інш. (прадукты інфармацыйна-карыстальніцкай дзейнасці). У межах другога кампанента ІРМЛЛ класіфікуюцца на падсістэмы, якія ўтрымліваюць веды рознага характару – ІРМЛ і ІРЛ. Рэсурсы гэтых падсістэм па спосабе стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі падзяляюцца на монакамунікацыйныя і полікамунікацыйныя, якія дыферынцуюцца па фармальных, функцыянальных і змястоўных прыметах [5; 7; 9].

3. Аналіз сучаснага стану дакументных патокаў БМЛ і БЛ, іх другаснага патоку і параўнанне з прапанаванай намі класіфікацыяй ІРМЛЛ сведчыць аб адсутнасці многіх важных элементаў у сістэме ІР БМЛЛ на фармальным, функцыянальным і змястоўным узроўнях класіфікацыі, дыспрапорцыях паміж living рознымі тыпамі і відамі выданняў і, як вынік, аб няпоўнай адпаведнасці існуючай сістэмы ІР БМЛЛ патрабаванням сучаснай навукі, адукацыі, сферы вольнага часу і неабходнасці яе аптымізацыі [4; 9; 10; 14].

Інтэрнэт-рэсурсы – важны кампанент сістэмы ІР БМЛЛ. Па тыпе кантэнту яны падзяляюцца на ўласна літаратурныя (электронныя бібліятэкі, электронныя літаратурна-мастацкія часопісы і газеты, персанальныя сайты аўтараў, перакладчыкаў, літаратуразнаўцаў) і змешанага кантэнту (сайты ўстаноў, фактаграфічныя рэсурсы, адукацыйныя рэсурсы, ленты навін, старонкі ў сацыяльных медыях). У адпаведнасці са спосабам стварэння выдзяляюцца алічбаваныя інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ (тэксты твораў у электронных бібліятэках, на персанальных сайтах і інш.) і першапачаткова створаныя ў лічбавым фармаце (інфармацыя ў сацыяльных медыях). Амаль што ўсе рэсурсы – сімбіёз літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры, большасць з іх утрымлівае таксама і бібліяграфічную інфармацыю [4; 9; 14].

Аптымізацыя сістэмы ІР БМЛЛ заснавана на ўдасканаленні яе функцыянальных, змястоўных і фармальных характарыстык. Неабходнымі ўмовамі пры гэтым з’яўляюцца: 1) рацыянальнае ўдасканаленне тыпа-відавога складу дакументаў за кошт выдання адсутных іх відаў пераважна ў электроннай форме; 2) актывізацыя выпуску навуковых дакументаў (манаграфій, зборнікаў навуковых артыкулаў, даследаванняў і матэрыялаў, навуковых выданняў БМЛ), стварэнне паўнатэкставых баз даных такіх дакументаў, што забяспечыць задавальненне патрэбнасцей навуковай сферы; 3) павелічэнне выдання падручнікаў для ўсіх ступеняў адукацыі, спецыфічных для галіны відаў вучэбных дакументаў (хрэстаматый, кніг для чытання, сачыненняў і інш.), што паспрыяе якаснаму інфармацыйнаму забеспячэнню сферы адукацыі; 4) рэалізацыя ў сістэме ІР БМЛЛ мультымедыйных форм прадстаўлення інфармацыі, якія кумулююць у адзінай інфармацыйнай прасторы тэкставую, гукавую, аўдыявізуальную, выяўленчую інфармацыю і маюць магчымасці інтэрактыўнага ўзаемадзеяння з карыстальнікамі, што дапаможа лепшаму засваенню ведаў; 5) развіццё збалансаванай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі, заснаванай на крыніцах спецыяльнай бягучай і рэтраспектыўнай навукова-дапаможнай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбна-дапаможнай і рэкамендацыйнай бібліяграфіі пераважна ў электроннай форме і даступных ў онлайнавым рэжыме, што будзе садзейнічаць эфектыўнаму інфармацыйнаму пошуку, пашырэнню сэрвісных магчымасцей літаратурнай бібліяграфіі; 6) дапаўненне сістэмы ІР БМЛЛ новым кампанентам асветніцкага кшталту – сінтэтычнымі рэсурсамі, даступнымі ў онлайн-рэжыме, у якіх камбінуецца першасная і другасная інфармацыя навуковага, папулярнага, вучэбнага, даведачнага характару; 7) забеспячэнне магчымасці онлайнавага доступу да якаснага кантэнту БМЛЛ на аснове інтэграванай інфармацыйнай платформы БМЛ і віртуальных літаратурных карт, дзе ў адзінай інфармацыйнай прасторы спалучаецца мастацкая, літаратуразнаўчая, вучэбная і рэкламная інфармацыя, прадастаўляюцца разнастайныя сэрвісныя магчымасці; 8) дапаўненне сістэмы ІР БМЛЛ функцыянальна неабходным кампанентам – электроннымі кнігамі для забеспячэння доступу да БМЛ з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій; 9) ажыццяўленне комплексу маркетынгавых мерапрыемстваў, у тым ліку інтэрнэт-маркетынгу і маркетынгу ў сацыяльных сетках, у мэтах павышэння цікавасці карыстальнікаў да БМЛ; 10) рэалізацыя праз сістэму бібліятэк творчых праектаў, накіраваных на папулярызацыю БМЛЛ як неабходнай умовы эфектыўнага функцыянавання ІР БМЛЛ у грамадстве [4; 14].

4. Для эфектыўнага функцыянавання ў грамадстве ІР БМЛЛ неабходна валоданне бібліятэкарамі-бібліёграфамі прафесійнай кампетэнтнасцю ў сферы папулярызацыі БМЛЛ, методыка фарміравання якой адрозніваецца тым, што прадугледжвае паслядоўнае двухэтапнае развіццё матывацыйна-каштоўнаснага, кагнітыўнага і дзейнасна-практычнага кампанентаў у межах вучэбнай дысцыпліны "Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства" пры выкананні пэўных педагагічных умоў: 1) стварэння інтэлектуальна-творчага асяроддзя з мэтай фарміравання асабовасная накіраванасці студэнтаў на вывучэнне і папулярызацыю нацыянальнай літаратуры ў прафесійнай дзейнасці; 2) арыентацыі зместу падрыхтоўкі на авалоданне студэнтамі ведамі і ўменнямі па стварэнні збалансаванай сістэмы ІР БМЛЛ ва ўмовах бібліятэкі і арганізацыі свабоднага доступу карыстальнікаў да яе кампанентаў; 3) развіцця навыкаў і вопыту творчай дзейнасці, накіраванай на папулярызацыю БМЛЛ праз публічныя бібліятэкі і іншыя ўстановы сістэмы дакументных камунікацый.

На інфармацыйна-аналітычным этапе пры рэалізацыі першай умовы ў студэнтаў выхоўваецца ўсведамленне важнасці працы бібліятэкара па далучэнні карыстальнікаў да нацыянальнай культуры праз прыцягненне іх да чытання твораў БМЛ, авалодання для гэтага спецыяльнымі ведамі, уменнямі і навыкамі. Гэта дасягаецца праз стварэнне інтэлектуальна-творчага асяроддзя для ўключэння студэнтаў у абмеркаванне праблем БМЛЛ, бібліятэчнай практыкі пры зносінах з дзеячамі літаратуры, бібліятэкарамі.

Выкананне другой умовы забяспечвае студэнтаў комплексам тэарэтычных ведаў аб сістэме ІР БМЛЛ, магчымасці выкарыстання яе элементаў у бібліятэчна-бібліяграфічным абслугоўванні карыстальнікаў. Асобае значэнне пры гэтым мае фарміраванне ўмення і навыкаў аналізу сучаснага стану і перспектыў развіцця сістэмы ІР БМЛЛ увогуле і суадносіны са станам сістэмы ІР БМЛЛ канкрэтнай бібліятэкі. У адукацыйным працэсе рэалізуюцца наступныя віды вучэбных заняткаў: лекцыі, семінары, практычныя, самастойныя работы. Выкарыстоўваецца праблемны метад, метад творчай правакацыі, адкрытага дыялогу, круглага стала, прэс-канферэнцыі. Студэнты выконваюць творчыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заданні, звязаныя з характарыстыкай з'яў нацыянальнай літаратуры, падрыхтоўкай электронных выстаў-прэзентацый твораў БМЛ.

На праектна-выніковым этапе пры рэалізацыі трэцяй умовы адбываецца знаёмства студэнтаў з бібліятэчнымі мерапрыемствамі, непасрэдная прафесійная камунікацыя з бібліятэкарамі-практыкамі ў межах майстар-класаў, практычных работ, удзел кожнага студэнта ва ўсіх этапах падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемства для рэальнай чытацкай аўдыторыі, у абмеркаванні яго вынікаў. Гэта садзейнічае набыццю практычнага вопыту распрацоўкі праектаў па папулярызацыі БМЛЛ ва ўмовах канкрэтнай бібліятэкі.

Вынікі праведзенага эксперыментальнага даследавання дакладна пацвярджаюць эфектыўнасць методыкі і педагагічных умоў фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ [6; 11; 12; 13; 14; 15].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Распрацаваныя і апрабаваныя педагагічныя ўмовы і двухэтапная методыка фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ, адпаведны дыягнастычны інструментарый (анкеты, тэсты) атрымалі ўкараненне ў навучальны працэс УА "БДУКМ" (акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 21.09.2012) і могуць ужывацца пры распрацоўцы методыкі фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў, накіраванай на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання іншых галіновых рэсурсаў.

Распрацаваны змест дысцыпліны "Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства" для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія", вучэбна-метадычны комплекс і вучэбная праграма атрымалі ўкараненне ў навучальны працэс УА "БДУКМ" (акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 20.09.2012 і ад 19.09.2012) і могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы спецыялістаў на базе вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў культуры і мастацтваў, у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Распрацаваныя майстар-класы спецыялістаў, мерапрыемствы на базе бібліятэк былі апрабаваны і знайшлі ўкараненне ў дзейнасці ДУ "Цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага" (акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 21.03.2012, ад 19.10.2012), бібліятэкі прыходу храма ў гонар іконы Божай Маці "Усіх пакутуючых радасць" (акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 21.05.2012) і могуць быць выкарыстаны пры арганізацыі навучання на базе іншых публічных бібліятэк і бібліятэк навучальных устаноў.

Распрацаваныя тэарэтычныя аспекты ІРМЛЛ: азначэнне, структура, уласцівасці, прынцыпы, класіфікацыя з'яўляюцца падставай для развіцця бібліятэказнаўчых, бібліяграфазнаўчых, кнігазнаўчых навуковых ведаў і могуць быць выкарыстаны для аптымізацыі практычнай бібліятэчнай дзейнасці па фарміраванні і выкарыстанні ІР БМЛЛ.

Вызначаныя ўмовы аптымізацыі сістэмы ІР БМЛЛ у мэтах удасканалення прафесійнай дзейнасці могуць быць выкарыстаны спецыялістамі навуковых, адукацыйных, выдавецкіх устаноў, рэдакцый літаратурных часопісаў і газет, бібліятэк, архіваў.

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых выданнях

1. Раманава, Ж.Л. Сучасныя падыходы да праблемы азначэння інфармацыйных рэсурсаў / Ж.Л. Раманава // Бібліятэчны свет. – 2004. – № 4. – С. 13–14.

2. Раманава, Ж.Л. Спецыяльныя функцыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры / Ж.Л. Раманава // Весці БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2005. – № 3 (45). – С. 96–101.

3. Раманава, Ж.Л. Прынцыпы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства / Ж.Л. Раманава // Весці БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2005. – № 4 (46). – С. 95–98.

4. Раманава, Ж.Л. Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры ў прасторы Інтэрнэт / Ж.Л. Раманава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2010. – № 1(13). – С. 112–119.

5. Раманава, Ж.Л. Праблема класіфікацыі інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства / Ж.Л. Раманава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 1 (15). – С. 133–140.

6. Раманава, Ж.Л. Фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці студэнтаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства / Ж.Л. Раманава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2013. – № 1 (19).– С. 110–117.

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых выданнях, рэкамендаваных ВАК для публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў для філалагічных спецыяльнасцей

7. Раманава, Ж.Л. Класіфікацыя інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: дзейнасна-інфармацыялагічны падыход / Ж.Л. Раманава // Вест. МГЛУ. Сер. 1, Филология. – 2006. – № 1 (21). – С. 254–256.

8. Раманава, Ж.Л. Спецыяльныя функцыі інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства / Ж.Л. Раманава // Вест. МГЛУ. Сер. 1, Филология. – 2006. – № 3 (19). – С. 200–208.

### Манаграфіі

9. Раманава, Ж.Л. Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як сродак навукова-эстэтычнай камунікацыі ў публічных бібліятэках // Бібліятэкі ў сістэме сацыякультурных камунікацый : манагр. / В.Е. Лявончыкаў, В.А. Касап, І.М. Стрыжонак, В.І. Саітава, Ж.Л. Раманава ; рэд. В.Е. Лявончыкаў, В.І. Саітава ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2011. – С. 100–148, 165–166. – Дэп. у ДУ “БелІСА” 21.04.2011, № Д201113.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Артыкулы ў навуковых зборніках

10. Раманава, Ж.Л. Аналіз развіцця дакументальнага патоку ў галіне беларускага літаратуразнаўства ў 2000–2004 гг. / Ж.Л. Раманава // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. : Т.А. Дзем'яновіч, Л.І. Доўнар, Т.А. Самайлюк – Мінск, 2006. – Ч. 2. – С. 163–170.

11. Раманава, Ж.Л. Прафесійная кампетэнтнасць спецыялістаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры як умова фарміравання культурна-адукацыйнага патэнцыялу карыстальнікаў у публічнай бібліятэцы / Ж.Л. Раманава // Бібліятэка і кніга ў сістэме бесперапыннай адукацыі : зб. навук. арт. [Электронны рэсурс] / В.Е. Лявончыкаў, В.А. Касап, Л.І. Доўнар, А.В. Прадзеіна, В.І. Саітава, І.М. Стрыжонак, Н.Ю. Вайцэховіч, Ж.Л. Раманава ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэд. : Л.І. Доўнар, В.І. Саітава. – Мінск, 2013. – С. 113–121. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 19.11.13, № Д201322.

12. Раманава, Ж.Л. Функцыі і кірункі дзейнасці публічных бібліятэк у сістэме бесперапыннай адукацыі / Ж.Л. Раманава // Бібліятэка і кніга ў сістэме бесперапыннай адукацыі : зб. навук. арт. [Электронны рэсурс] / В.Е. Лявончыкаў, В.А. Касап, Л.І. Доўнар, А.В. Прадзеіна, В.І. Саітава, І.М. Стрыжонак, Н.Ю. Вайцэховіч, Ж.Л. Раманава ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэд.: Л.І. Доўнар, В.І. Саітава. – Мінск, 2013. – С. 34–44. – Бібліягр. : с. 43–44 (14 назв.). – Дэп. у ДУ "БелІСА" 19.11.13, № Д201322.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый і семінараў

13. Романова, Ж.Л. Патриотическое воспитание студентов как средство гармонизации личности в ходе учебного процесса на факультете информационно-документных коммуникаций в Белорусском государственном университете культуры и искусств / Ж.Л. Романова // Актуальные вопросы патриотического воспитания молодежи Союзного государства : заседание тридцатое, г. Минск, 8–9 нояб. 2012 г. / под ред. С.Г. Стрельченко. – Минск : Центр системного анализа и стратегических исследований НАН Беларуси, 2012. – С. 165–171.

14. Раманава, Ж.Л. Асноўныя кірункі фарміравання і папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры ва ўмовах інфармацыйнага грамадства / Ж.Л. Раманава // Материалы междунар. конгр. «Библиотека как феномен культуры», Минск, 23–24 окт. 2013 г. / Нац. б-ка Беларуси ; сост. А.А. Суша. – Минск, 2013. – С. 229–234.

### Вучэбна-метадычныя і іншыя матэрыялы

15. Раманава, Ж.Л. Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства : вучэбная праграма па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Ж.Л. Раманава. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 15, [1] с. : табл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

**Раманава Жанна Леанідаўна**

**Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: тэарэтыка-метадычны аспект**

**Ключавыя словы:** агульныя і прыватныя прынцыпы, беларуская мастацкая літаратура, дакументны паток, інтэрнэт-рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, інфармацыйныя рэсурсы, інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, класіфікацыя, літаратуразнаўства, метасістэмныя і спецыфічныя ўласцівасці, навуковыя і мастацка-вобразныя веды, папулярызацыя, прафесійная кампетэнтнасць у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, спецыяльныя функцыі.

**Мэта даследавання:** абгрунтаванне тэарэтыка-метадычных асноў інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

**Метады даследавання:** *тэарэтычныя* (аналіз і сінтэз, абагульненне, параўнанне, класіфікацыя); *эмпірычныя* (назіранне, педагагічны эксперымент, анкетаванне, тэставанне); *статыстычныя* (бібліяметрычны, метад статыстычнай апрацоўкі вынікаў эксперыментальнай работы).

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** вызначаны паняцце і структура інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, удакладнены іх метасістэмныя і выяўлены спецыфічныя ўласцівасці, прынцыпы, функцыі, распрацавана класіфікацыя, даследаваны сучасны стан сістэмы інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, прапанаваны ўмовы яе аптымізацыі, распрацаваны, абгрунтаваны і апрабаваны методыка і педагагічныя ўмовы фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, распрацаваны адпаведны дыягнастычны інструментарый.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні**: вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў адукацыйным працэсе пры падрыхтоўцы бібліятэкараў-бібліёграфаў на базе вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў культуры і мастацтваў, у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, пры арганізацыі практыка-арыентаванага навучання на базе публічных бібліятэк і бібліятэк навучальных устаноў, а таксама для аптымізацыі практычнай бібліятэчнай дзейнасці па фарміраванні і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

**Галіна выкарыстання**: бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, педагогіка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЕЗЮМЕ

**Романова Жанна Леонидовна**

**Информационные ресурсы белорусской художественной литературы и литературоведения: теоретико-методический аспект**

**Ключевые слова:** белорусская художественная литература, документный поток, интернет-ресурсы белорусской художественной литературы и литературоведения, информационные ресурсы, информационные ресурсы художественной литературы и литературоведения, классификация, литературоведение, метасистемные и специфические свойства, научные и художественно-образные знания, общие и частные принципы, популяризация, профессиональная компетентность в сфере популяризации белорусской худжественной литературы и литератураведения, специальные функции.

**Цель исследования:** обоснование теоретико-методических основ информационных ресурсов белорусской художественной литературы и литературоведения.

**Методы исследования:** *теоретические* (анализ и синтез, обобщение, сравнение, классификация); *эмпирические* (наблюдение, педагогический эксперимент, анкетирование, тестирование); *статистические* (библиометрический, метод статистической обработки результатов экспериментальной работы).

**Полученные результаты и их новизна:** определены понятие и структура информационных ресурсов художественной литературы и литературоведения, уточнены их метасистемные и выявлены специфические свойства, принципы, функции, разработана классификация, исследовано современное состояние системы информационных ресурсов белорусской художественной литературы и литературоведения, предложены условия её оптимизации, разработаны, обоснованы и апробированы методика и педагогические условия формирования профессиональной компетентности библиотекарей-библиографов в сфере популяризации белорусской художественной литературы и литературоведения, разработан соответствующий диагностический инструментарий.

**Рекомендации по использованию:** результаты исследования могут быть использованы в образовательном процессе при подготовке библиотекарей-библиографов на базе высших и средних специальных учебных заведений культуры и искусств, в системе повышения квалификации и переподготовки кадров, при организации практико-ориентированного обучения на базе публичных библиотек и библиотек учебных заведений, а также для оптимизации практической библиотечной деятельности по формированию и использованию информационных ресурсов белорусской художественной литературы и литературоведения.

**Область применения:** библиотечно-информационная деятельность, педагогика.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Zhanna L. Romanova**

### Information resources of Belarusian fiction and study of literature: theoretic and methodic aspect

**Keywords:** Belarusian fiction, flow of documents, knowledge, information resources, Internet-resources of fiction and study of literature, information resources, information resources of fiction and study of literature, classification, study of literature, meta-system and specific qualities, artistic-imaginative knowledges, general and specific principles, popularization, professional competence in the field of promotion of the Belarusian fiction and study of literature, special functions.

**Research objective:** reasoning theoretic and methodic bases of the information resources of Belarusian fiction and study of literature.

**Research methods:** *theoretical* (analysis and synthesis, generalization, comparison, classification); *empirical* (observation, pedagogic experiment, questioning, testing); *statistical* (bibliometric, method of statistical analysis of results of the experimental work).

**Obtained results and their novelty:** concept and structure of the information resources of fiction and study of literature have been defined, have been clarified their meta-system and identified their specific qualities, principles, functions, worked out classification, actual state of the system of the information resources of Belarusian fiction and study of literature has been studied, terms of its optimization have been proposed, the methodology and pedagogical conditions of librarians-bibliographers professional competence in the sphere of promoting of the Belarusian fiction and study of literature have been developed, proved and tested, the appropriate diagnostic tool has been elaborated.

**Recommendations for the use:** results of research may be used in educational process during the librarians-bibliographers training on the basis of higher and average special education institutions of culture and arts, in the system of professional development and retraining of personnel, at the organization of the practice-oriented training on the basis of public libraries and libraries of educational institutions and also for optimization of practical library activities on formation and use of information resources of the Belarusian fiction and study of literature.

**Field of application:** library and information activity, pedagogy.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навуковае выданне*

**Раманава Жанна Леанідаўна**

**Інфармацыйныя рэсурсы
беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства:
тэарэтыка-метадычны аспект**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства
і кнігазнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк 11.11.2015 г. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Бумага офісная. Рызаграфія.
Умоўн. друк. арк. 1,89. Улік.-выд. арк. 1,45. Тыраж 60 экз. Заказ № 84.

Паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск